# ЗЯРНЯТКА 1

2 верасня 2018 г. XXII Звычайная нядзеля, Год В

*Вы пакінулі запаведзь Божую, а трымаецеся чалавечай традыцыі.* *Мк 7, 1–8. 14–15. 21–23*

Сышліся разам да Езуса фарысеі і некаторыя з кніжнікаў, якія прыйшлі з Ерузалема. І ўбачылі, што некаторыя вучні Ягоныя елі хлеб нячыстымі, гэта значыць, неабмытымі рукамі. Фарысеі ж і ўсе юдэі, трымаючыся традыцыі старэйшых, не ядуць, пакуль старанна не памыюць рук. І вярнуўшыся з рынку, не ядуць, пакуль не абмыюцца. Ёсць і яшчэ шмат таго, чаго прынята трымацца: абмыцця кубкаў, і збаноў, і місаў, і лавак.



Тады пытаюцца ў Яго фарысеі і кніжнікі: Чаму вучні Твае не трымаюцца традыцыі старэйшых, але ядуць хлеб нячыстымі рукамі?

Ён адказаў ім: Добра прарочыў Ісая наконт вас, крывадушных, як напісана: Народ гэты шануе Мяне вуснамі, а сэрцы іх далёка ад Мяне. Але марна пакланяюцца Мне, навучаючы вучэнню чалавечых запаведзяў. Бо вы пакінулі запаведзь Божую, а трымаецеся чалавечай традыцыі.

Потым зноў паклікаў народ і сказаў яму: Слухайце Мяне ўсе і разумейце. Няма нічога, што магло б, уваходзячы звонку ў чалавека, зрабіць яго нячыстым, але тое робіць чалавека нячыстым, што выходзіць з яго.

Бо знутры, з чалавечага сэрца, выходзяць благія думкі, распуста, крадзеж, забойствы, зайздрасць, чужалоства, сквапнасць, зласлівасць, падступнасць, бессаромнасць, блюзнерства, пыха, глупства. Усё гэтае зло знутры выходзіць і робіць чалавека нячыстым.

*Гэта слова Пана.*

## Пане, хто можа жыць у Тваім шатры?



**Запрашаю цябе на заняткі катэхезы! План заняткаў можаш убачыць на дошчы аб'яваў у касцёле або у класе, або спытацца ў сястры Уладзіміры. Езус чакае цябе, прыходзь!**

У Евангеллі мы чытаем, якія паводзіны робяць чалавека "нячыстым". Знайдзі 13 слоў і выдзялі іх у табліцы. Словы можна прачытаць у розных напрамках: з лева на права і, наадварот, з права на лева. А таксама па вертыкалі.

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| с | п | к | р | а | д | ж | е | ж | м | о | з |
| к | х | о | р | а | с | п | у | с | т | а | т |
| в | і | к | м | у | д | я | і | г | а | л | б |
| а | й | а | в | т | с | п | у | л | г | о | к |
| п | е | з | а | б | о | й | с | т | в | ы | м |
| н | ч | у | ж | а | л | о | с | т | в | а | ф |
| а | з | а | й | з | д | р | а | с | ц | ь | я |
| с | б | г | а | а | х | ы | п | в | о | н | у |
| ь | б | л | ю | з | н | е | р | с | т | в | а |
| ь | ц | с | а | в | і | л | с | а | л | з | р |
| б | е | сс | а | р | о | м | н | а | с | ц | ь |
| п | а | д | с | т | у | п | н | а | с | ц | ь |

## Апостальскае заданне на кожны дзень тыдня:

А. Маліся за людзей, якія не маюць добрых думак, жаданняў і ўчынкаў, каб яны сталі добрымі.

Б. Зрабі рахунак сумлення. Падумай, калі ты ў сваім жыцці становішся падобны да фарысеяў. Перапрасі Пана Езуса і пастарайся быць лепшым.

В. Калі ты робіш каму-небудзь заўвагу, памятай, каб рабіць гэта з пакораю і братняй любоўю.